*УДК 372.881*

# ВЫХАВАННЕ ГУМАНІСТЫЧНАЙ АСОБЫ ПРАЗ ВЫКАРЫСТАННЕ ІНАВАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРЫ

**С. П. Прышчэпчык**

*Дзяржаўная установа адукацыі «Сярэдняя школа № 12 ім. В. У. Бабко г. Гродна», вул. Паповіча, 32, 230024, г. Гродна, Беларусь, svetlana-mc7@mail.ru*

У артыкуле разглядаюцца асаблівасці выкарыстання інавацыйных тэхналогій пры навучанні літаратуры для рэалізацыі аксіялагічнага падыходу. Звяртаецца ўвага на выкарысанне магчымасцей музея.

***Ключавыя словы:*** інавацыйныя тэхналогіі; праблемныя ўрокі; гуманістычная пазіцыя; каштоўнасныя кампетэнцыі; музейная дзейнасць; адукацыйны прадукт.

# EDUCATION OF HUMANISTIC PERSONALITY THROUGH THE USE OF INNOVATIVE TECHNOLOGIES AT LITERATURE LESSONS

**S. P. Pryshchepchyk**

*State Educational Institution«Secondary school № 12 named after V. V. Babko, Grodno», Popovicha St., 32, 230024, Grodno, Belarus, svetlana-mc7@mail.ru*

Consideration is given to the use of innovative technologies in the study of literature to implement an axiological approach. Attention is paid to the use of museum possibilities.

***Key words:*** innovative technologies; problematic lessons; humanistic position; value competencies; museum avtivity; educational product.

Літаратура – адзін з найбоьш эфектыўных і цікавых шляхоў спасціжэння духоўнага развіцця грамадства, «прадмет, які выконвае культуратворчую і нацыятворчую функцыі, садзейнічае гуманітарызацыі мыслення. Народ Беларусі – гэта складовая частка агульначалавечай супольнасці, таму ў творах беларускіх пісьменнікаў выявіліся агульназначныя ідэалы і каштоўнасці. Далучэнне да іх мае выключна важнае значэнне, паколькі спрыяе гуманізацыі асобы, духоўна ўзбагачае яе. Арыентацыя на гуманістычныя і культурныя каштоўнасці, краіназнаўчы аспект пры вывучэнні літаратуры набывае асаблівае значэнне ў новай інфармацыйнай рэальнасці» [1, с. 52].

Вывучэнне літаратурных твораў інтэлектуальна развівае, выхоўвае асобу з гуманістычным светапоглядам, скіраваную на агульначалавечыя каштоўнасці. Прыходзіцца прызнаць, што сучасныя сродкі інфармацыі не вельмі спрыяюць гэтаму. Місія ж настаўніка-славесніка заключаецца і актуалізуецца ў тым, каб супрацьстаяць бездухоўнаму і дэструктыўнаму праз урокі літаратуры.

Да сродкаў, якія садзейнічаюць рэалізацыі выхавання гуманістычнай асобы, адносяцца інавацыйныя тэхналогіі, якія дазваляюць увесці новае ў мэты, змест, метады і формы навучання і выхавання, арганізацыю сумеснай дзейнасці настаўніка і вучня. Галоўнай мэтай інавацыйнага выхавання з'яўляецца падрыхтоўка вучня да жыцця, якое ўвесь час мяняецца. Мэтай інавацыйнай дзейнасці з'яўляецца якаснае змяненне асобы вучня ў параўнанні з традыцыйнай сістэмай. На сённяшні дзень плённа спрацоўваюць такія тэхналогіі, як тэхналогія эўрыстычнага (крэатыўнага) навучання, тэхналогія праблемнага навучання, праектная тэхналогія, інтэрактыўныя тэхналогіі і інш. [2, с. 7].

Яшчэ адным прыярытэтным накірункам з'яўляецца распрацоўка і ўкараненне новых форм урокаў. Калі кіравацца азначэннем сучасных навукоўцаў-метадыстаў (І. М. Гоўзіч, В. У. Праскаловіч, А. В. Руцкай), гэта не толькі ўрокі-арыгінальныя па структуры і арганізацыі, а ўрокі, якія забяспечваюць актывізацыю мысліцельнай дзейнасці вучняў і ўтрымліваюць асноўную гуманістычную місію, «садзейнічаюць паспяховай сацыялізацыі падлеткаў» [3, с. 304]. Гэта ўрокі-экскурсіі, урокі-спаборніцтвы, урокі-дыскусіі, урокі-доказы, урокі-турніры, урокі-спектаклі, урокі-інтэрв'ю і інш.

Арыентацыя на новыя формы апраўданая з аднаго боку тым, што выклікана запатрабаваннямі грамадства ў ініцыятыўных, самастойных, творча мыслячых, здольных да нестандартных рашэнняў і навучаных працаваць у камандзе маладых людзей. З другога боку, свядомасць сучаснага вучня ўжо не прымае традыцыйнага педагагічнага ўздзеяння – прамой рэпрадуктыўнай перадачы ведаў. Сёння сістэма кіравання ўрокам патрабуе больш гнуткіх механізмаў дзейнасці [4, с. 167].

Як паказвае практыка, у памяці вучняў пасля заканчэння школы застаецца невялікая колькасць урокаў, якія дапамагаюць жыць, а тых, да якіх звернуты не толькі розум, але і сэрца – яшчэ меней. Тым не менш, у жыцці кожнага чалавека абавязкова наступае момант сур'ёзных выпрабаванняў і менавіта ў такія моманты, як правіла, узгадваюцца тыя шчырыя дыялогі, дыскусіі аб самых значных каштоўнасцях, даверальныя размовы, што адбываліся на ўроках, дзе не даваліся гатовыя веды, не

навязваліся погляды, а адкрываліся, выстройваліся ў выніку даследавання, краналі, запаміналіся і зместам, і формай.

У найбольшай ступені адпавядаюць гэтым патрабаванням праблемна-інтэграваныя ўрокі, напрыклад, урок-разважанне, урок-даследаванне, урок-памяць, урок адкрытых думак. Адна з форм іх правядзення базуецца на прыцягненні адпаведнай інфармацыі з розных крыніц (дакументальных, гістарычных, краязнаўчых і інш.). У аснову такой формы пакладзены прынцып узаемапранікнення: светапоглядная праблема, якая ўтрымліваецца ў змесце вучэбнага матэрыялу і падаецца як платформа для разважання, уключэння ў дзейнасць вучняў, а прадмет разгляду паступова пашыраецца, нарошчваецца праз зварот да непасрэднага літаратурнага тэксту або шэрагу твораў. Такім чынам павышаецца ўзровень зацікаўленасці і пазнавальнай актыўнасці. Напрыклад, апавяданне Змітрака Бядулі «На Каляды к сыну» ўзрушвае душэўнай драмай старой маці, ад якой адрокся сын. Прымушае задумацца падлеткаў і апавяданне Віктара Карамазава «Дзяльба кабанчыка», дзе паказана духоўнае адчужэнне дзяцей ад бацькоўскага дома і ад маці, іх душэўная чэрствасць, а з другога боку раскрываецца адказнасць і высокая маральнасць маці-працаўніцы, яе клопаты аб дабрабыце дзяцей. Ухваляюцца ўчынкі сына Сцяпана, які ўсведамляе сваю віну перад маці. У выніку ўрока-роздуму па творчасці Рыгора Барадуліна, дзеці прыходзяць да высновы, што трэба любіць сваіх бацькоў, пастаянна клапаціцца аб іх, а калі пакінулі бацькоўскі дом, то неабходна часта прыязджаць, наведваць. Да гэтай жа высновы вучні прыходзяць, знаёмячыся з вершам Рыгора Барадуліна «Трэба дома бываць часцей» або разважаючы над радкамі:

*Наведвайце бацькоў,*
*пакуль яны жывыя,*
*Пакуль дымяцца коміны –*
*нагрэйцеся ў бацькоў.*

Нямала твораў прысвечана паказу трагедыі народа ў ваеннае ліхалецце, якое пакінула свой жахлівы след, знішчыўшы мільёны жыццяў, скалечыўшы мільёны лёсаў. Творы В. Быкава, І. Навуменкі, І. Шамякіна, Я. Брыля, І. Чыгрынава раскрываюць нам злачынную сутнасць вайны. Найбольш плённым пры разглядзе такіх твораў з’яўляюцца ўрокі-дыскусіі, урокі-разважанні і ўрокі адкрытых думак, якія раскрываюць праз нечаканыя ракурсы, якія прымушаюць сур’ёзна думаць і разважаць. Напрыклад, урок-дыскусію варта выкарыстаць пры разглядзе апавядання І. Чыгрынава «У ціхім тумане», бо змест твора раскрывае драматычную сітуацыю, якую пакінула пасля сябе вайна. Сюжэт на пачатку падаецца вучням вонкава простым: у вёску прыходзіць старая жанчына (Рэйдзіха),

яна хоча знайсці магілу сына. Гора яе зразумелае, але праблема ў тым, што яе сын здраднік, які ўдзельнічаў у знішчэнні жыхароў і спаліў вёску. Партызаны застрэлілі яго. Вучні з разуменнем ставяцца да гэтага – яна маці. Але сваю гуманістычную пазіцыю, сваё ўяўленне пра чалавечнасць і даравальнасць аўтар увасобіў праз вобраз Ганны Тараськавай. У гэтым вобразе мы бачым выяўленне найвышэйшай ступені хрысціянскай літасцівасці. Гэта Ганнінага бацьку забіў сын Рэйдзіхі. Але яна пускае старую ў свой дом пераначаваць. Такую сітуацыю вучні прымаюць неаднназначна. Большасць, як правіла, ухваляе, але астатнія не згодны. Настаўнік у такой сітуацыі не павінен адразу заяўляць, што апошнія памыляюцца. Сутнасць дыскусіі палягае ў адстойванні пазіцый. Але адстойванне гэта павінна быць абгрунтаваным. Задача настаўніка – умела скіроўваць дыскусію ў патрэбнае рэчышча. Гэта могуць быць пытанні, парады звярнуць увагу на адпаведныя радкі тэкста, эпізоды. У дадзеным выпадку акцэнтуецца ўвага на тым, што гэты ўчынак –здольнасць даравацць – прыносіць Ганне душэўнае заспакаенне. Прымушае змяніць свае памылковыя пазіцыі і зварот да вышэйшай меры майстэрскага апісання мацярынскага адчаю на месцы, дзе закапаны яе сын. Чытаючы, як худымі старэчымі рукамі Рэйдзіха спрабуе нагрэбсці хоць нейкі грудок на месцы бясслаўнага прыстанку яе сына, вучні пачынаюць гаварыць аб знакавасці памяці, аб помніках, абеліскаx, памятных знаках, якія ўвекавечваюць і ахвяр, і змагароў. Падсумоўваецца дыскусія паведамленнем, што, ствараючы гэта апавяданне на аснове рэальнай падзеі, аўтар узгадваў навуку сваёй бабулі, якая кіравалася запаветам з Бібліі: «Не судзіце, каб вас не судзілі, бо, якім судом судзіце, такім і вас судзіцьмуць. ... І ва ўсім, як хочаце, каб рабілі з вамі, так і вы рабіце». Роздум над такімі творамі абуджае ў свядомасці чытачоў самае светлае і чалавечнае, тое што мы называем і што з’яўляецца агульначалавечымі каштоўнасцямі.

Фарміраванню каштоўнасных кампетэнцый садзейнічае і зварот да адукацыйнай дзйнасці музеяў, якая выяўляецца ў трох аспектах: пазнавальным, творчым і сацыяльным [5, с. 40].

Сучасная, удасканаленая тэхналогія музейнай дзейнасці (мультымедыя, стварэнне віртуальнага асяроддзя і інш.) вельмі эфектыўная, але ўсё ж плённасць і выніковасць ад наведвання музея залежыць і ад прадуманых дзеянняў настаўніка. Яго задача палягае ў тым, каб вучні былі не пасіўнымі гледачамі, а зацікаўленымі творцамі. Для гэтай мэты, папершае, вызначаецца як стратэгія дзейнасці пэўная тэхналогія, напрыклад, праектная, эўрыстычная ці інш., па-другое, загадзя распрацоўваюцца апераджальныя заданні. Да таго ж важна, каб гэтыя заданні былі разнастай-

ныя, каб вучні мелі магчымасць выбару і змаглі стварыць уласны адукацыйны прадукт, які можна было б пасля выкарыстаць на ўроку.

Звернемся да канкрэтнага прыкладу – вывучэнне творчасці М. Багдановіча. Непасрэдна перад першым урокам гэтай манаграфічнай тэмы настаўнік з вучнямі наведвае музей (можна скарыстаць ІТ). Але перад экскурсіяй вучняў важна нацэліць на стварэнне адукацыйных прадуктаў, якія будуць пасля выкарыстаны на ўроках і ацэнены. Каб забяспечыць разнастайнасць, якаснасць і мэтанакіраванасць, вучням прапануюцца апераджальныя заданні. Да кожнага задання настаўнік павінен даць кароткія каментарыі па яго выкананні.

Заданні могуць быць прыкладна такімі:

1. Маршрутная турыстычная карта «Сцяжынамі М. Багдановіча».
2. «Па старонках сямейнага альбома» – саматробны альбом.
3. Інфармацыйны глог-плакат: жыццё і творчасць М. Багдановіча.
4. Міні-інсцэніроўка (Тэатралізацыя першай сустрэчы Максіма і Ані Какуевай).
5. Кросэнс. Сябры і блізкія Максіма.
6. Прэзентацыя «Вобраз М. Багдановіча ў жывапісе».
7. Максім Багдановіч і музыка.
8. Самаробны зборнік вершаў «Прысвячэнні Максіму».
9. Віктарына па біяграфіі і творчасці паэта.
10. Водгук на верш Багдановіча (на выбар).
11. Тэкст экскурсіі «М. Багдановіч. Гародня, маленства».
12. Уражанне ад экскурсіі ў музей у форме нататкі, замалёўкі-ўражання або рэпартажа.
13. Крыжаванкі, кластары.
14. Ілюстрацыі да некалькіх твораў М.Багдановіча.
15. Ідэя помніка паэту ў Гродна (месцазнаходжанне, форма, пастамент, пліта-выявы, надпісы, памеры, асаблівасці выявы, спадарожная атрыбутыка, акаляючая прастора – дрэвы, кветнік, аздабленне).
16. Эсэ «Роздум над артыкулам пра санет».

Практыка паказвае, што вучэбны матэрыял, прадстаўлены ў змененай ці новай форме, перастае ўспрымацца як звычайнае паўтарэнне, а прымашае задумацца, зразумець і запомніць, абуджае духоўныя пачуцці.

Такім чынам, навучанне беларускай літаратуры праз выкарыстанне інавацыйных тэхналогій, умелае спалучэнне розных форм урокаў, уключэнне вучняў у розныя віды дзейнасці, развіццё пазнавальнай актыўнасці плённа садзейнічае выпрацоўцы каштоўнасна-светапоглядная кампетэнцыі.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. *Праскаловіч В. У.*, *Шаўлякова-Барзенка І. Л.* Канцэпцыя вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» (V–XI класы). Праект // Род. слова. 2016. № 3. С. 51–60.

2. *Праскаловіч В. У.* Інавацыйная адукацыйная прастора філолага: рэаліі і перспектывы // Філалагічная адукацыя: навук.-метад. зб. / рэдкал. : А. І. Бельскі (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БДУ, 2019. Вып. 3.

3. *Трофимова О. В.* Нетрадиционные формы урока и социализация учащихся. М. : Центр «Педагогический поиск», 2003.

4. *Праскаловіч В. У.* Методыка выкладання беларускай літаратуры. Практыкум: вучэб.- метад. дапам. Мінск : БДУ, 2022.

5. *Столяров, Б. А.* Музейная педагогика: история, теория, практика: учеб. пособие. М. : Высш. шк., 2004.